Чаму, калі часта баліць галава, трэба абследаваць пазваночнік – пра гэта чытайце на 6-й стар.

На простор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 84 (4439)

25 кастрычніка 2019 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

ДИПКУРЬЕР

В Нур-Султане открылось новое посольство Беларуси



В Казахстане с официальным визитом находится Александр Лукашенко.

Вчера в Нур-Султане торжественно открыли новое здание белорусского посольства. Символическую красную ленточку разрезали заместитель премьер-министра Казахстана **Роман Скляр** и заместитель премьер-министра Беларуси **Александр Турчин**.

Казахские СМИ сообщили, что новое здание посольства Беларуси состоит из административного здания, включающего в себя зал приемов, конференц-зал, переговорные помещения, кабинеты сотрудников, библиотеку, а также жилого дома с десятью квартирами и двумя гостиничными номерами, подземного паркинга и резиденции посла Республики Беларусь. Территория комплекса – почти 9 тысяч квадратных метров.

Александр Лукашенко на церемонии открытия посольства не присутствовал. Сразу после прилета в Нур-Султан (в аэропорту его встречал президент Казахстана **Касым-Жомарт Токаев)** Александр Лукашенко возложил венок к монументу «Защитники Отечества». Сегодня главы государств проведут переговоры.

Игорь ЗАЛЕССКИЙ.

БЕЛАРУСЬ – КАЗАХСТАН:
гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва



Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Казахстан устаноўлены 16 верасня 1992 года.

Важным элементам двухбаковага супрацоўніцтва з'яўляецца Міжурадавая казахстанска-беларуская камісія па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, якая функцыянуе з 1996 года.

Казахстан уваходзіць у тройку асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі ў СНД.

Тавараабарот паміж Казахстанам і Беларуссю ў 2018 годзе склаў $895,6 млн (павялічыўся на 30,0%*).

Экспарт - $783,3 млн (+32,3%) **Імпарт - $112,3 млн (+15,6%)**



У студзені-чэрвені 2019 года тавараабарот паміж краінамі склаў $481,7 млн (павялічыўся на 11,8%**).

БЕЛАРУСЬ ПАСТАЎЛЯЕ Ў КАЗАХСТАН



трактары,
малочныя прадукты,
сельскагаспадарчую тэхніку,
грузавыя аўтамабілі,
мэблю

КАЗАХСТАН ПАСТАЎЛЯЕ Ў БЕЛАРУСЬ



каменны вугаль,
газ і нафтапрадукты,
бавоўну,
метал,
металічныя вырабы

* у параўнанні з 2017 годам
** у параўнанні з аналагічным перыядам 2018 года

Крыніца: Нацыянальны статыстычны камітэт Беларусі, МЗС Беларусі © Інфаграфіка БЕЛТА

СУМНЫ ФАКТ

Сярэдні заробак знізіўся

І гэта ўжо другі месяц запар. У жніўні намінальны налічаны сярэдні заробак стаў меншы на 10,7 рубля, у верасні – яшчэ на на 9,3 рубля. Як паведамляе Белстат, у мінулым месяцы сярэдняя зарплата ў Беларусі склалада 1108,5 рубля.

У Мінску ў верасні сярэдні заробак быў 1516,2 рубля,
у Мінскай вобласці – 1117,3,
у Гомельскай – 995,7,
у Брэсцкай – 971,3,
у Гродзенскай – 960,7,
у Віцебскай – 945,5,
у Магілёўскай вобласці – 930,9 рубля.

Іван ШЫРОКІ.

СКАНДАЛ

На тэлебачанне не пусцілі

Выступленне грамадскай актывісткі Паліны Шарэнда-Панасюк на "Беларусь 3", можна сказаць, прэцэдэнт сёлетняй выбарчай кампаніі, які, праўда, скончыўся зняццем кандыдата з выбараў.

Перадвыбарныя прамовы сябраў Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Уладзіміра Няпомняшчых**, які абіраецца па Гомельскай-Цэнтральнай акрузе №33, і **Ірыны Давідовіч** (Іўеўская выбарчая акруга №54) у эфір не трапілі.

Прычым падзеі на тэлебачанні і ў Гродне, і ў Гомелі разгортваліся, нібы пад капірку. Кандыдаты ў прызначаны час прыходзілі на запіс сваіх прамоў, аднак на наступны дзень іх выступленні ў эфір не ставілі. Напрыклад, замест выступлення Ірыны Давідовіч 23 красавіка ў 19.35 на канале "Беларусь 3" жыхарам гродзенскага рэгіёна паказалі фільм пра Камянецкую вежу. Пры гэтым ніякіх тлумачэнняў кандыдатам у дэпутаты тэлевізіёншчыкі не далі. Палітыкі толькі могуць здагадвацца, чаму іх прамовы не прайшлі цэнзуру.

Няпомняшчых мяркуе, што яго не пусцілі ў эфір таму, што ў сваім выступленні ён гаварыў пра "народжанага ў канька" і імпічмент прэзідэнта. Давідовіч таксама ўзгадвала слова "імпічмент", казала, што, калі ёй удасца стаць дэпутатам, яна выступіць за пачатак імпічменту кіраўніка дзяржавы.

Зараз кандыдаты рыхтуюць скаргі, якія дашлюць у Цэнтрвыбаркам, а таксама дырэктарам абласных тэлекампаній і старшыням аблвыканкамаў.

"Народная Воля" таксама вырашыла даведацца, што стала падставай зняцця з эфіру выступленняў кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Няпомняшчых і Ірыны Давідовіч.

У прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі патлумачылі: *"Кандыдатам адмоўлена ў прадастаўленні эфірнага часу на падставе пункта 22 гл.4 Палажэння аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 7-га склікання, зацверджанага Пастановай Цэнтральнай выбарчай камісіі ад 28 жніўня 2019 года".*


Мы зазірнулі ў тэкст Палажэння. Пункт 22 гл.4, на які спаслаўся прадстаўнік прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі, у сваю чаргу адсылае да Выбарчага кодэкса, ягоных артыкулаў 47 і 75, якія не дазваляюць у праграмных выступленнях кандыдатаў і падчас агітацыйнай кампаніі прапаганды вайны, заклікаў да гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу, парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, абразы і паклёпу ў дачыненні да службовых асоб Рэспублікі Беларусь.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

(Працяг тэмы на 2-й стар.)

ПРАГНОЗЫ

Які прысуд чакае Паліенку?



Сёння ў Мінскім гарадскім судзе будзе вынесена рашэнне па справе сацыяльнага актывіста.

Нагадаем, што спачатку Зміцера Паліенку абвінавачвалі па чатырох артыкулах Крымінальнага кодэкса: ч.3 арт.339 – распыленне пярцовага газу ў твар мужчыне на лесвічнай пляцоўцы; арт.341 – нанясенне графіці ў Курапатах і на будынак на вуліцы Ахоцкай; ч.1 арт.130 – распальванне варожасці да супрацоўнікаў міліцыі ў размешчаным у інтэрнэце відэаролiку; арт.369 – абраза міністра (былога) МУС **Ігара Шуневіча** ў відэаролiку.

Але нечакана ў дзень пачатку працэсу стала вядома, што суд будзе разглядаць абвінавачванне Паліенкі толькі ў распыленні пярцовага газу, а абвінавачванні па іншых артыкулах зняты, бо ад іх адмовілася пракуратура.

Пасля некалькі дзён працэсу пракурор папрасіў суд прызнаць Змітра вінаватым і прызначыць **пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на шэсць гадоў, а на падставе закона «Аб амністыі» скараціць тэрмін на адзін год**.

"Як мы бачым, з Паліенкі знялі палітычныя артыкулы, пакінуўшы толькі самы цяжкі – «хуліганку», – пракаментаваў гэтую справу паплечнік Змітра **Мікола Дзядок**. – *І гэта якраз-такі даволі кепска.*

Тое, што абвінавачванні зняў пракурор, на мой погляд, сведчыць пра тое, што гэта было загадзя ўзгодненым дзеяннем. План, верагодна, у тым, каб пазбавіць Змітра падтрымкі праваабаронцаў (а тым самым – статусу палітвязня), навесіўшы яму выключна крымінальны артыкул. Нічога добрага ў гэтым я не бачу".

Віктар ШПАК.

АКТУАЛИИ

Светлана КАЛИНКИНА



Демократия для Ананич

Вы удивитесь, конечно, но эксперты говорят, что мы дожили до демократии. Не настоящей, конечно, не взаправдашней, а состряпанной где-то по иранскому образцу. Это когда действительно проходят выборы, когда люди на самом деле выбирают, когда результат голосования непредсказуем. Но вся эта борьба позволяется исключительно среди так называемых «своих».

Вроде бы нечто подобное на нынешних выборах вырисовывается и у нас. Не везде, не по всем округам. Но все-таки.

Вот например, Борисовский сельский избирательный округ №63, где в Палату представителей баллотируются экс-министр информации Лилия Ананич, ныне – заместитель председателя общественной организации «Белорусский союз женщин». Естественно, даже речи не идет о такой демократии, чтобы с Ананич спросили за дискриминацию в Беларуси многих независимых средств массовой информации при полном попустительстве разгулу российской пропаганды. Просто потому, что предвыборные дебаты по нашему законодательству необязательны, да и ни одного кандидата от оппозиции в этом округе нет, некому спрашивать. Зато кто есть? Статист от либерал-демократов некто Игорь Закревский и начальник местного горрайотдела по чрезвычайным ситуациям Владимир Пикуза.

Экс-министр или главный пожарник? Ананич или Пикуза? Кто выиграет выборы? Оба беспартийные, оба собирали подписи избирателей, ни одного не выдвигал трудовой коллектив. Кто в конечном итоге получит мандат?.. Однозначного ответа на данный момент нет. Интрига. Как и положено на настоящих выборах.

Или другой пример – Бобруйский сельский избирательный округ №80. Здесь всего два кандидата в депутаты – главный врач центральной больницы и директор местного лесхоза. Оба беспартийные, оба собирали подписи избирателей, обоих выдвинули трудовые коллективы. Да, недовольным избирателям выбирать не из кого: как ни голосуй – попадешь в кандидата власти. Но кто и почему в конечном итоге станет депутатом, тоже совершенно не понятно. И тут интрига.

Действующему депутату Игорю Марзалюку в Могилевском-Ленинском избирательном округе №84 противостоит заместитель директора «Могилевлифтмаша» Сергей Чертков. Действующий депутат Ольга Петрашова в Могилевском-Октябрьском избирательном округе №86 соперничает с директором Могилевского вагоностроительного завода Виталием Мартыновым. Даже «красавице Маше» – «Мисс Беларусь» Марии Василевич, которая часто сопровождает белорусского президента, – путь в парламент тоже не кажется расчищенным. Вместе с Василевич в округе баллотируется директор коммунального предприятия «Ремавтодор Фрунзенского района Минска» Геннадий Насевич. Серьезный мужик под 50 пошел на выборы, чтобы стать мальчиком для битья ради 22-летней фаворитки? Хочется верить, что во власти все-таки не до такой степени все запущено...

Эксперты насчитали около 60 таких округов, где кандидат власти не очевиден, где претенденты на депутатский мандат находятся в одной политической весовой категории, а значит, результат выборов пока предсказать невозможно.

Политологи и журналисты чешут затылки в недоумении: что бы это значило? Ведь наши выборы всегда были предсказуемы, и на том, собственно, система держалась, а тут все идет вразнос. Да, в пользу своих. Да, без конкуренции с яркими представителями оппозиции. Но все-таки это уже выглядит как другой сценарий.

Впрочем, весьма вероятно, что все разрешится раньше, чем мы поймем, в чем задумка и что происходит. Так, вопрос очень просто сняли в Волковысском избирательном округе №48. Здесь поначалу было аж три так называемых «кандидата власти» – главный лесничий Волковысского лесхоза, заведующая районной нотариальной конторой и начальник районного отдела МЧС. Но на данный момент никакой интриги нет – два первых претендента добровольно отказались от дальнейшего участия в выборах. Не исключено, что так произойдет и по другим округам: ко дню голосования останется один кандидат власти, и выборы пройдут так, как проходили все последние годы.

Но нельзя исключить, что на нынешних выборах действительно обкатывается некий вариант «контролируемой демократии». Ведь пинают белорусскую власть за выборы и справа, и слева, и внутри страны, и снаружи. Только наблюдатели от СНГ упорно всем довольны, но все остальные давно поняли, что избирательный процесс в Беларуси есть, а настоящих выборов нет, что происходит всего лишь их имитация. И как бы ни хорохорилась Лидия Ермошина, всем понятно, что с белорусскими выборами надо что-то делать, что-то менять.

Иранский опыт в этом смысле просто находка. Весь мир признает, что в Иране действительно проходят выборы, но при этом власть остается жестко авторитарной, почти тоталитарной, инакомыслие не допускается и строго карается. Чем не «белорусская мечта»?

Но если мы действительно в выборах присматриваемся к Ирану, то Александру Лукашенко, видимо, забыли рассказать, в чем суть фокуса. Ведь даже если организовать «демократию для своих», честно считать голоса, отданные за кандидатов власти, и честно определять среди них победителя – это все равно еще не выборы. А иранский феномен как раз в том, что там действительно выборы есть.

Так в чем же дело? Что не рассказали Александру Лукашенко?

Суть иранского политического феномена в том, что в этой жестко авторитарной стране существует реальная конкуренция между ветвями власти. И, соответственно, там выборы – это не выбор между фаворитами, а все-таки политическое состязание. Там кипят страсти, проходят дебаты, собираются многотысячные митинги, и выборы становятся действительно политической борьбой с непредсказуемым результатом.

У нас конкуренция между ветвями власти есть? У нас между ветвями власти есть борьба идей, видений, стратегий? У нас кандидатам власти надо бороться за избирателя или надо бороться за покровителя в высоких кабинетах?

Вот вам и ответ, почему даже «демократия для своих» реально не приближает Беларусь к народовластию, к выборам, где результат определяют люди, избиратели, отдающие свои голоса. То есть даже до иранской демократии нам сегодня так же далеко, как до зарплаты в тысячу долларов. Вдумайтесь: даже до «иранской демократии»! Хотя, казалось бы, где Иран, а где демократия?.. Но мы и до них не можем подпрыгнуть.

МИРОВАЯ НОВОСТЬ

Останки испанского диктатора Франко вывезены из мавзолея

Вчера на вертолете останки Франко были доставлены для захоронения на муниципальное кладбище в районе Эль-Пардо на севере Мадрида, где находится могила его жены.

Процедура перезахоронения проходила в условиях повышенных мер безопасности и заняла несколько часов. На эксгумации присутствовали лишь министр юстиции Испании, судмедэксперт, священник и 22 потомка Франко.



«Это огромная победа во имя достоинства, памяти, справедливости и воздаяния – а значит, во имя испанской демократии», – сказал премьер-министр страны Педро Санчес.

Семья Франко долго и безуспешно оспаривала перезахоронение в суде.

Социалистическое правительство Испании давно обещало перенести останки диктатора из мавзолея в обычную могилу, чтобы, как выразились власти, не прославлять фашиста, правившего страной почти 40 лет.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 КАСТРЫЧНІКА 2019 г.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Як Паліне Шарэнда-Панасюк удалося выступіць з востракрытычнай прамовай на тэлебачанні

*Выступленне на тэлебачанні кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, актывісткі грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» з Брэста **Паліны Шарэнда-Панасюк** выклікала вялікі рэзананс у грамадстве. Ролік з прамовай Паліны, а таксама яе тэкст растыражавалі некаторыя СМІ і каналы ў інтэрнэце. Публікацыі ўжо ў першы дзень сабралі тысячы праглядаў і сотні каментарыяў. «Брава!», «Малайчына!» «Нам патрэбны такія дэпутаты!» – пакідалі свае водгукі ў інтэрнэце беларусы.*

«Народная Воля» распытала кандыдата ў дэпутаты пра тое, як удалося праўдзіва з такой востракрытычнай перадвыбарнай прамовай на дзяржаўны тэлеканал, чаму яна вырашыла ісці на выбары, хаця сама лічыць, што іх «у Беларусі няма з 1994 года», а таксама пра тое, чым яшчэ займаецца, акрамя палітыкі.

– Паліна, шмат каго ўразіла ваша смелае, эмацыянальнае выступленне на канале "Беларусь 3". Як яно рыхтавалася? Ці была цэнзура перад запісам? Напрыклад, ці прасілі вас прыбраць з перадвыбарнай прамовы слова «дыктатар»?

– Я ўпершыню аказалася на Беларускім тэлебачанні і была ўражана, як кажуць, з парога.

Запіс выступлення – а гэта не жывы эфір – праходзіў у Брэсце на тэлерадыёкампаніі "Брэст". Напэўна, у іншых краінах такі дагляд, які я ўбачыла на ўваходзе на абласное тэлебачанне, ладзяць на сверхсакрэтных ваенных аб'ектах: турнікеты, металашукальнікі, міліцыянер-цэрбер, які падпарадкоўваецца начальству з Мінска. Мяне хіба што толькі не распранулі цалкам – так шчыльна аглядалі! Потым нават супрацоўнікі рэдакцыі, адказныя за запіс, выбачаліся перада мной, казалі: "Даруйце, нам самім няёмка, што такая прапускная сістэма на тэлебачанні".

А што тычыцца самога выступлення, тэкст мы пісалі камандай. Часу на яго падрыхтоўку амаль не было. На наступны дзень пасля рэгістрацыі мяне ўжо запрасілі на запіс… У маёй прамове выверана кожнае слова! Я, канешне, трэніравалася напярэдадні запісу – не штодня ж ты выступаеш перад камерай. Але эмацыянальным выступленне атрымалася таму, што кожнае слова, кожная думка ішла ад сэрца. Упэўненасць у сваёй праве давала мне сілы.

– То бок ніякай цэнзуры не было?

– Літаральна за хвіліну да запісу ў пакой прыбегла нейкая ўзрушаная жанчына (мне падаецца, што яна нават і не прадставілася) з раздрукаваным тэкстам маёй прамовы – і пачала войкаць, што, маўляў, у маім выступленні ўтрымліваюцца непрымальныя выразы, якія немагчыма прапусціць у эфір. Лукашэнку я называю дыктатарам, а гэта, казала яна, абраза: ён – прэзідэнт, а не дыктатар. На гэтую заўвагу я адказала так: "Дыктатар – гэта не абраза, а паліталагічны тэрмін. У любым падручніку па паліталогіі вы знойдзеце гэта слова ў прымяненні да канкрэтнага чалавека, яно сотні разоў ужывацца".

– Прэтэнзія была знята?

– Мяне папярэдзілі, што БТ здымае з сябе адказнасць за маю прамову. Была абраза ці не, будзе разбірацца выбарчая камісія.

– То бок калі б тэкст прызналі непрымальным, яго проста не пусцілі б у эфір – у тэлевізійншчыкаў быў на гэта час…

– Напэўна, так. Мажліва, палічылі, што "Беларусь 3" не належыць да папулярных беларускіх каналаў, тым больш што ён не грамадска-палітычны, пазіцыяніруе сябе як канал, які адлюстроўвае культурніцкія падзеі ў краіне. Каму прыйдзе ў галаву шукаць на ім выступленні кандыдатаў у дэпутаты?! А калі іх пачуюць тры з паловай чалавекі, то бяды вялікай няма.

– Але ролік з вашым выступленнем шырока разышоўся ў інтэрнэце. Ці не думалі пра тое, што можаце зноў трапіць пад артыкул пра абразу прэзідэнта? Два гады таму вас ужо спрабавалі абвінавачыць у гэтым: тады справа да суда не дайшла…

– Узбудзяць крымінальную справу за слова "дыктатар" – калі ласка. Я палічу гэта прызнаннем рэжымам маіх заслуг…

– Паліна, а хто ваш асноўны канкурэнт на выбарах?

– Нельга казаць пра канкурэнцыю на выбарах у нашай краіне, бо іх папросту няма. Калі б гэта былі сапраўдныя выбары з усімі належнымі атрыбутамі, тады можна было б казаць пра канкурэнцыю. Уявіць хаця б выступлені кандыдатаў на тэлебачанні. У цывілізаваных краінах перад выбарамі ўсе эфіры аддадзены кандыдатам: яны выступаюць, даюць інтэрв'ю, спрачаюцца… А ў нас 5 хвілін на агітацыю! Не ведаю, ці ёсць дзесьці ў свеце яшчэ краіны, дзе так здзекаваліся б з выбараў! Хто-небудзь яшчэ дадумаўся пра абразлівыя пяць хвілін на агітацыю?

– А вы самі прапаноўвалі свім сапернікам дэбаты?

– Канеше, прапанавала! Даслала паведамленне ў выбарчую камісію, што хацела б правесці дэбаты, мне сказалі: "Добра, чакайце, калі з тэлебачання патэлефануюць, калі будзеце запрошаны…"

– Дык хто балатуецца па вашай акрузе? Яны пагадзіліся на дэбаты?

– Ад улад ідзе дзейны дэпутат Леанід Брыч – прадстаўнік канапнай Беларускай патрыятычнай партыі, якога адразу зарэгістравалі і ад партыі, і ад працоўнага калектыву, і праз збор подпісаў. Ён раней працаваў у Брэсце, быў такім класічным сучасным начальнічкам і на мінулых выбарах прайшоў у Палату прадстаўнікоў менавіта па Брэсцкай-Заходняй акрузе №1. Брыч, дарэчы, таксама запісаўся на дэбаты.

Зарэгістравана па нашай акрузе трэцяя асоба – Уладзімір Курыловіч, ён балатуецца ад яшчэ адной малавядомай партыі, якая ажывае перад выбарамі, – Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці. Яму не тое што дэбаты не патрэбны, Курыловіч нават адмовіўся выступаць з перадвыбарнай праграмай па тэлебачанні! І гэта кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў! Затое вядомым усяму Брэсту актывістам, праціўнікам будаўніцтва акумулятарнага завода Віктару Маркоўскаму і блогеру Аляксандру Кабанаву з розных прычын у рэгістрацыі адмовілі.

– Чаму вас пакінулі, як думаеце?

– Не ведаю… Ці не знайшлі, да чаго дачапіцца, ці проста не было каманды зверху мяне зрэзаць. Мажліва, гэта такая гульня. Некалькіх чалавек, якія супраць будаўніцтва АКБ, але гучна пра гэта не выступаюць і не ўяўляюць небяспекі для ўлад, зарэгістравалі кандыдатамі. Дэмакратыя па-беларуску…

– Вы сабе не супярэчыце? Вы ж актыўны, "гучны" праціўнік будаўніцтва завода – і вы кандыдат.

– Здараюцца выключэнні з правіл…

– Вы казалі пра вашых сапернікаў-кандыдатаў як пра прадстаўнікоў малавядомых партый. Як думаеце, вы ў Брэсце чалавек пазнавальны? Ці многа людзей ведае пра існаванне такой грамадскай кампаніі, як "Еўрапейская Беларусь"?

– Выбарчая кампанія – гэта якраз нагода, каб людзі з ёю пазнаёміліся, даведаліся, што ёсць такая арганізацыя.

Акрамя таго, падчас перадвыбарнай агітацыі ёсць магчымасць сустракацца з людзьмі, камунікаваць з рознымі сацыяльнымі пластамі і казаць пра сітуацыю, у якой Беларусь аказалася ў апошнія гады: гэта і Астравецкая АЭС, і дэкрэт аб дармаедах, і небяспечныя дамовы з Расіяй, фактычна – будучы аншлюс… І мы ўжо ладзім пікеты, плануем праводзіць іх кожны дзень.



– Паліна, а які ваш стаж актыўнай палітычнай і грамадскай дзейнасці?

– Амаль 20 гадоў, з канца 1990-х, калі я пачынала яшчэ ў "Маладым фронце".

– Колькі вам гадоў?

– Я нарадзілася ў 1975 годзе.

– Дзе працуеце? За кошт чаго жывяце? Ваш муж Андрэй Шарэнда таксама грамадскі актывіст, актыўны ўдзельнік розных акцый. Адных толькі штрафаў вы выплацілі за гэтыя гады на суму ў тысячы рублёў. Дарэчы, падлічвалі колькі?

– Мажліва, за ўсе гады некалькі тысяч долараў набярэцца…

Давайце не будзем хітраваць: у нашай краіне людзям, якія маюць актыўную грамадзянскую пазіцыю, выпісаны воўчы білет, на дзяржаўную працу іх фактычна не бяруць… У лепшым выпадку вы можаце працаваць толькі на сябе, але ўлады, калі захочуць, знойдуць, да чаго прычапіцца. Апошняя сітуацыя з Аляксандрам Кабанавым – таму прыклад…

Муж час ад часу шукае падпрацоўкі, ездзіць у Польшчу. Я ў дадзены момант працую рэпетытарам польскай мовы. Гадую двух сыноў: Стаху тры гады, Славаміру – дзесяць… Такі наш выбар паміж грашыма і сумленнем.

– Як вашы бацькі ставяцца да такой пазіцыі? Два апазіцыйныя палітыкі ў адной сям'і – гэта няпроста.

– Падтрымліваюць, дапамагаюць.

– Дарэчы, вы добра ведаеце польскую мову. З'ехаць у Польшчу не думалі?

– Некаторы час я працавала ў Польшчы… Мая пазіцыя такая: трэба імкнуцца да таго, каб варункі працы, якія ёсць у Польшчы, былі і ў Беларусі. Сёння сапраўды адбываецца катастрофа: беларусы эшалонамі з'язджаюць на заробкі за мяжу. Магчыма, у Мінску гэта не так бачна. А ў Брэсце і асабліва ў маленькіх гарадах – гэта вельмі заўважна, там па вуліцах ходзяць толькі жанчыны з дзецьмі і пенсіянеры, амаль адсутнічае цэлы пласт насельніцтва – мужчыны ад 30 да 50. Яны вымушана працуюць за мяжой! Некаторыя потым не вяртаюцца і забіраюць з сабой сем'і – Беларусь пустошыцца. Гэта вельмі трывожна. І мы мусім гэта змяніць!

Марыя ЭЙСМАНТ.

КАЛІ ВЯРСТАЎСЯ НУМАР

Паліну Шарэнда-Панасюк знялі з выбараў

Учора такое рашэнне прыняла выбарчая камісія Брэсцкай-Заходняй акругі №1.

Паліна кажа, што для яе такая навіна не шок і не сенсацыя, а цалкам прадказальная сітуацыя.

– *Мне патэлефанавалі і запрасілі на пазачарговае пасяджэнне камісіі*, – расказвае Паліна. – *Сказалі, што ёсць да мяне пытанні. І я, праўда, не думала, што пытанне будзе ставіцца такім чынам – зняць мяне з выбарчай гонкі. Паколькі на гэты час у мяне была прызначана сустрэча ў брэсцкай абласной газеце наконт друкавання маёй праграмы, на пасяджэнне камісіі пайшла мая давераная асоба Андрэй Шарэнда. І ён прынёс вось такую навіну… Афіцыйную паперу аддадуць 25 кастрычніка.*

Падставай для зняцця Паліны Шарэнда-Панасюк з выбараў сталі два рапарты супрацоўнікаў Ленінскага РАУС Брэста з відэаматэрыяламі, якія паступілі ў акруговую выбарчую камісію. У рапартах сцвярджалася, што падчас пікетаў 21 і 22 кастрычніка каманда Паліны Шарэнда-Панасюк не расказвала пра выбарчую праграму кандыдата, а ладзіла мітынг, "*падчас якога гучалі паклёп і абразы ў дачыненні да службовых асоб краіны ўсіх узроўняў, заклікі да выхаду на вуліцу з мэтай змены ўлады, заклікі, якія падахвочваюць да зрыву або адмены прызначаных парламенцкіх выбараў*". Аналагічныя парушэнні, на думку членаў камісіі, адзначаны і ў выступленні Паліны Шарэнда-Панасюк па тэлебачанні. Таксама камісія палічыла, што кандыдат у дэпутаты парушыла патрабаванні да падрыхтоўкі друкаваных агітацыйных матэрыялаў: яны выдаваліся да адкрыцця рахунку выбарчага фонду кандыдата, таксама ўлёткі ўтрымлівалі тыя ж заклікі, якія гучалі падчас правядзення выбарчых пікетаў.

У выніку камісія вырашыла адмяніць сваё папярэдняе рашэнне аб рэгістрацыі кандыдатам ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Паліны Шарэнда-Панасюк. Прагаласавалі члены камісіі аднагалосна.

– Канешне, я буду абскарджваць гэтае рашэнне, наколькі мажліва, мы яшчэ пазмагаемся, – адзначыла ў каментарыі "Народнай Волі" Паліна.

Іван ШЫРОКІ.

ПОЗИЦИЯ



Гарри Погоняйло подал жалобу в суд на ЦИК, Минюст и Аппарат Совета Министров

Известный юрист, председатель юридической комиссии Белорусского Хельсинкского комитета требует возбудить гражданское производство и приостановить действие Центральной избирательной комиссии, иных органов государственной власти, органов местного управления и самоуправления по проведению выборов в палаты Парламента, назначенных на 7 и 17 ноября 2019 года.

Гарри Погоняйло считает, что постановления Центризбиркома о проведении в эти дни выборов в Палату представителей и Совет Республики не соответствуют действующему законодательству о сроках полномочий парламента 6-го созыва. Дело в том, что первая сессия нынешнего парламента состоялась 11 октября 2016 года, и в соответствии с Конституцией и избирательным законодательством свои полномочия парламент должен завершить не позднее 11 октября 2020 года. Фактически в связи с назначенными очередными выборами депутаты без каких-либо правовых оснований недоработают 11 месяцев, то есть две сессии, или одну четверть своего конституционного срока. Гарри Погоняйло обратил внимание на этот правовой казус и подал в ЦИК заявление с просьбой о том, чтобы Центральная комиссия на своем заседании рассмотрела данный вопрос и обратилась к президенту и парламенту за толкованием законодательства о выборах.

В своем ответе юристу ЦИК указала, что «*нормы Конституции Республики Беларусь устанавливают только предельно поздние сроки для проведения выборов и не содержат требований, ограничивающих более ранний период их проведения*». «*Тем самым Центризбирком*, – говорит Гарри Погоняйло, – *в нарушение своих полномочий вместо законодателя сам истолковал нормы Конституции*». Юрист обратился в Центризбирком с повторной жалобой, однако она осталась без рассмотрения по существу.

Следующий шаг председателя юридической комиссии БХК – направление инициативных обращений в парламент, Совет Министров и Верховный Суд с просьбой инициировать в Конституционном Суде производство о проверке конституционности изданных президентом указов о назначении выборов и постановлений ЦИК об их проведении.

Однако Совет Министров, как и остальные субъекты, отказались направить данные обращения в Конституционный Суд.

– *В частности*, – говорит Гарри Погоняйло, – *Совет Министров запросил по данному обращению мнение той же Центральной комиссии, Министерства юстиции и Министерства финансов. Из ответов, которые я получил, вытекает, что заинтересованные лица, подменяя Конституционный Суд, сами истолковали спорные акты и действия должностных лиц, признав их конституционными. Тем самым лишили меня права на доступ к конституционному правосудию, гарантированному ст. 60 Конституции.*

Естественно, такой поворот событий Гарри Погоняйло не устроил. 24 октября юрист обратился с жалобой в суд Московского района Минска.

В своей жалобе председатель юридической комиссии БХК указывает, что «*функционирование Парламента в течение четырех лет является не только конституционным нормативом (предписанием), но и, прежде всего, реализацией права граждан Республики Беларусь как непосредственно, так и через свободно избранных представителей участвовать в управлении своей страной (статьи 37, 38 Конституции). Такой подход полностью соответствует Международному пакту о гражданских и политических правах (статья 25) и Документу копенгагенского совещания конференции по человеческому измерению ОБСЕ (пункты 5, 6, 7 и т.д.)*». Также юрист отмечает, что «*в результате манипуляций нормами Конституции молодые граждане Республики Беларусь, которые достигнут возраста 21 года в первой половине 2020 года, лишились права быть избранными депутатами Палаты представителей Национального собрания.*

Спорные указы посягают и на гарантии, установленные Законом «О статусе депутата Палаты представителей, члена Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь», о сроках их полномочий в четыре года».

Гарри Погоняйло просит суд признать незаконными действия Центральной избирательной комиссии, Министерства юстиции и Аппарата Советов Министров и обязать их устранить допущенные нарушения в соответствии с их компетенцией. Он также ходатайствует перед судом о применении средств по обеспечению жалобы, в частности, «*приостановить действия Центральной комиссии, иных органов государственной власти, органов местного управления и самоуправления по проведению выборов в палаты Парламента, назначенных на 7 и 17 ноября 2019 года, до их устранения*».

– Я подал жалобу в суд, чтобы показать, что правовые инструменты в стране, к сожалению, не действуют, что нужно защищать принципы верховенства права и разделения полномочий ветвей власти, что без восстановления конституционности в полном объеме нельзя говорить об укреплении демократии в нашей стране, – комментирует Гарри Погоняйло.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

СТОП-КРАН

Педагогі стаяць сцяной!

*Назіральніка кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" **Аляксея Лойку** выгналі са школы.*

Ён хацеў папрысутнічаць на сустрэчы праўладнай кандыдаткі **Марыны Лянчэўскай** з працоўным калектывам сярэдняй школы №157 г.Мінска. Нягледзячы на тое, што сустрэча анансавалася толькі як для педкалектыва, Лянчэўская асабіста дазволіла назіральніку прысутнічаць на ёй.

Як паведамляе spring96.org, калі назіральнік з'явіўся ў школе, дырэктар установы **Святлана Скроцкая** вырашыла, што яму не варта прысутнічаць на гэтай сустрэчы, і пачала выштурхоўваць назіральніка з хола. На дапамогу ёй прыйшоў настаўнік гісторыі **Сяргей Юдзінец**. Дырэктар вырашыла, што школа – рэжымны аб'ект, а таму яна мае права паводзіць сябе такім чынам.

Алег Лойка напісаў заяву ў Фрунзенскі раённы аддзел Следчага камітэта аб узбуджэнні крымінальнай справы па факце непраамернага прымянення фізічнай сілы да яго з боку абодвух педагогаў. У якасці доказаў ён прасіў праглядзець усе відэакамеры, якія размешчаны ў фае і на першым паверсе школы.

Сяргей НІКАНОРАЎ.

ДА ЎВАГІ!

Махляры не ведаюць межаў

У кастрычніку супрацоўнікі крымінальнага вышуку і ДАІ затрымалі восем аўтамабіляў з расійскімі рэгістрацыйнымі знакамі, якімі кіравалі грамадзяне Беларусі.

Як паведаміла прэс-служба МУС, праваахоўнікі засумняваліся ў ідэнтыфікацыйных нумарах (VIN) гэтых аўто. Міліцыянеры звярнулі ўвагу на такія дарагія іншамаркі, як Mazda CX-5, Infiniti, Range Rover Evoque, Chevrolet ды іншыя.

Высвеілася, што Lexus, затрыманы ў Мінску, быў скрадзены ў Санкт-Пецярбургу. А Toyota Camry, якую затрымалі на Віцебшчыне, шукаў гаспадар з Маскоўскай вобласці.

Пры гэтым некаторыя з уладальнікаў ведалі пра крымінальнае мінулае сваіх аўто.

Народная Воля http://www.nv-online.info 25 КАСТРЫЧНІКА 2019 г.

АНАТОМИЯ ПРЕСТУПЛЕНИЯ

ДЕТОУБИЙЦА-ТИХОНЯ

Органы опеки отдали отцу из приюта его детей. А на того «нахлынули эмоции»…

В белом доме, у голубого колодца

Самые страшные трагедии случаются в самые прозаичные будни.

…Вечерело. Солнце тихо опускалось за разноцветный лес – бархатный октябрь дарил всем успокоение и надежду. Кирилл и Вероника приехали с детьми к своему дому на велосипедах. Скоро в их кухне зажегся свет. Мужчина во дворе стал колоть дрова. Семья готовилась к ужину.

На селе ни одна соседская занавеска не шелохнется, а жизнь каждого у всех на виду. Впрочем, ничего не предвещало беды, все в тот пятничный вечер спокойно заснули в Мадейках. Все, кроме Кирилла и Вероники. А уже наутро маленькую деревню затрясло так, что волны до сих пор идут по всей стране. В белом доме у голубого колодца произошло немыслимое, садистское преступление: отец зверски избил свою четырехлетнюю дочь. Один из ударов был такой силы, что у дитя треснул череп. И через двое суток девочка скончалась в реанимации.

Мадейки вздрогнули: они жили рядом с садистом?!

Но в этой трагедии все комком, все чудовищно и нелогично. Про детоубийцу Кирилла ни одна живая душа до сих пор не сказала ни одного плохого слова. Он был трезвенником, на людях – тихоней. С другой стороны, каждый рассказ про него – что односельчан, что чиновников, что директора Новодевятковской средней школы, в которой учился Кирилл, – начинался так: «Он – чужой. Он не из наших мест». Я так и не выяснила, где же родился этот человек, откуда приехал с матерью, ведь по паспорту он все же гражданин Беларуси. Но прописка и официальный документ – это, как выясняется, еще не все. Надо еще жить так, чтобы люди считали тебя своим.

Впрочем, сейчас, после злодейства, кто хочет быть земляком зверя в обличие человека?

Человек-«загадка»

Молодой человек приехал в Мадейки недавно – сожительствовать с Вероникой. Ему двадцать пять, ей двадцать. Наверное, хотели, чтобы сложилось что-то путное… Хотя у каждого из них за спиной натоптано грязи, хоть огород сажай. У Кирилла росли малышки Маргарита и Евгения. Но их родная мать отбывает срок в тюрьме, лишена родительских прав. У Вероники на руках своя кроха Елизавета. Родила ее, еще учась в школе, которую потом так и не закончила. Отец ребенка? Да ветер в поле! Вот с таким «бэкграундом» двое соединились в семью, хотя официально не зарегистрированную. Кирилл не работал, был в декретном отпуске, получал пособие по уходу за младшим ребенком. Вероника трудилась как умела: рабочей в местном социальном приюте для стариков и инвалидов всего на полставки. Представляете доходы на пять человек? Пусть даже несколько куриц во дворе и десять соток картофеля в поле, все равно это сущие гроши. Суровая бедность. Но от этого разве можно озвереть и убить собственного ребенка? Ну, если ты недочеловек, то – наверное…

Я шла по Мадейкам и мимо воли вспоминала знаменитую цитату Чехова: «Какие красивые деревья, и, в сущности, какая должна быть около них красивая жизнь!» Редко увидишь такой гармоничный ландшафт, как в Зельвенском районе, хотя чудесных мест в Беларуси, конечно, немало. Но здесь что-то очень человеческое, очень соразмерное душе: лес на дальнем пригорке, луга перед ним. И все это, как дорогая картина, как богатые декорации, прямо перед окнами сельчан. Жить бы да радоваться. А вот разговариваем об убийстве. Мужчины уходят в сторону курить, женщины вздыхают, но чувств скрыть не могут. Хотя просят свои фамилии не упоминать, чтобы даже опосредованно не быть рядом с криминалом. Все они, конечно, уже который день в шоке. Юзефа Евгеньевна, чей дом в самом начале деревни, призналась:

– Я как услышала у автолавки, что ребенок до полусмерти избит, так сердце мое будто заледенело, даже забыла хлеба купить. Вернулась домой в полуобмороке. Разве есть на земле такая причина, чтобы дитя головой о стену бить? Свою родную кровиночку…

У нее самой пятеро внуков, каждое лето ее дом, как семечками, полон малыми детьми. До сих пор в песочнице лежит куча игрушек – да дети у нее, видать, не только в песочнице хозяева.

– Здесь все для них, любимых, – каждое яблоко, каждая лучшая ягода с огорода. Шлепнешь порой и сразу приголубишь, – признается бабушка. И берется за голову, вспоминая Кирилла: – Парень этот не из наших мест… У нас такого никогда не было! Как быть таким зверем? А ведь шел по улице – всегда чисто одет. И водку никогда не покупал в автолавке.



Это до сих пор загадка для всех Мадеек – водку-пиво человек не употреблял, а в одночасье слетел с катушек. Был бы алкоголиком, а так… Поэтому другого объяснения преступления, кроме как внезапное сумасшествие, моментальный распад личности, у сельчан нет.

Вера Константиновна вторит соседке, тем более что ее усадьба прямо напротив дома Кирилла и Вероники:

– Никогда не видела его выпившим, пьяным. О насилии в семье и подумать было нельзя. Кирилл вообще никогда не кричал. И дети у них были чистенькие. А потом вдруг убийство… Понаехали милиция, журналисты со всей страны… А участковый нам еще в субботу сказал, что надежды на жизнь у девочки нет. Она худенькая, маленькая, а он ее бил ногами, потом бросил головой о стену (*это факты из официального сообщения Следственного комитета. – **Ред**.*). Что-то нечеловеческое… Мы прийти в себя который день не можем от этого происшествия! Я уже и в огород не хожу…

Полное бесчувствие

Как сообщил Следственный комитет, Кирилл сам вызвал «скорую помощь», когда увидел, что дочка лежит без сознания. Опомнился? Кирилла задержали, он дает показания, уже состоялся следственный эксперимент: на фото, которое распространил СК, видно, как парень на резиновой кукле показывает, что делал с дочерью. От одного этого можно впасть в вечную депрессию.

Что послужило поводом для такой отцовской ярости, мы пока не знаем. Впрочем, может ли вообще четырехлетнее дитя настолько тяжко провиниться, чтобы за это его били ногами? Тем более родной отец… Чем, скажите на милость, взрослого так рассердила, обидела малышка, что человек превратился в зверя? Его сожительница говорит: «Нахлынули эмоции…» Да, ну конечно: это просто очень сильные чувства. Или, скорее, полное бесчувствие.

Сейчас два соседних райисполкома – Зельвенский (в котором задержанный проживал) и Слонимский (в котором прописан) – тщательно проверяют все документы, касающиеся Кирилла и его детей. Младшая девочка Евгения срочно помещена в приют, и – внимание! – на ее теле тоже обнаружены ссадины и несвежие гематомы. Как установили врачи, на теле погибшей также обнаружены старые гематомы! Значит, отец наказывал – избивал! – детей регулярно? И инспекторы из органов опеки об этом не знали, не догадывались?!

Да, младшая девочка сейчас вроде бы здорова, хотя и сильно напугана. С ней работают психологи. Но мое внимание привлек вот какой факт. Несколько лет назад, после того как биологическая мать девочек попала в тюрьму, сестры были отданы органами опеки на воспитание в приют. То есть Кирилл, родной отец, сначала не захотел (не мог?) брать на себя ответственность за их воспитание. Но через какое-то время он пришел со своей матерью в райисполком с заявлением, чтобы государство вернуло ему дочек. Можно ли было отказать отцу? И предотвратить таким образом трагедию?

В Слонимском райисполкоме считают, что нельзя. А если разбираться неформально?.. Я еще раз задаюсь вопросом: как часто и как серьезно проверяли потом инспектора из органов опеки эту семью, атмосферу в ней, житейский уклад? Если не догадывались о побоях, то почему их хотя бы не смущали нищенские доходы, на которые существовали там дети?

О родительских правах. И государственных обязанностях

Конечно, в семье, пусть и неполной, психологически детям лучше, чем в приюте. Это аксиома. Но – в семье, а не в избушке на курьих ножках, в которой правит тихоня-насильник. Как только дети оказались рядом, Кирилл уволился с работы, сам стал ухаживать за ними. И жить на детское пособие. Я не имею права утверждать, что детские деньги были основной мотивацией отца, но скажу, что именно ради детского пособия очень многие взрослые добиваются возвращения себе родительских прав. В редакцию часто приходят письма с такими просьбами: мол, мы уже исправились! Мы всегда за простых людей: начинаем письма проверять, выезжаем на место. И выясняется, что во главе угла у матери-отца, например, не совесть, ответственность и родительская любовь, а банальная корысть – чтобы не высчитывали из зарплаты на содержание детей в государственном приюте.

Но в данном случае к Кириллу трудно было придраться. По крайней мере видимых причин не было. Молодой человек был на приеме у председателя Слонимского райисполкома Г.Б.Хомича, произвел, как сказал Геннадий Болеславович, положительное впечатление. И соответствующие документы о жилплощади и работе на ферме имелись. Девочек из приюта отцу отдали. А теперь старшую оплакивают люди...

Дикое преступление. И, к сожалению, статистика детоубийств в Беларуси говорит о том, что они совершаются у нас постоянно. Похоже, это происходит во все времена. Матери после родов в состоянии аффекта убивают младенцев, душат, выбрасывают новорожденных в снег, в туалет, в мусорный бачок, чтобы скрыть свой грех… Разве мало сообщений на эту тему в уголовной хронике? Да чуть ли не каждый месяц! Мужчины в тяжелом алкогольном бреду тоже не ведают, что творят: как звери, нападают на собственных детей с оружием, выбрасывают их из окон, душат. И если женщин лечат от психического расстройства, а потом отправляют отбывать наказание, то к отцам за преступление против детства у нас применяют смертную казнь. Нет снисхождения к мужчинам-детоубийцам. Вот и сейчас я наблюдаю такую же реакцию у общественности... И лично мне очень трудно почувствовать в своем сердце спасительное милосердие… Но, конечно, главное слово – за следствием и судом.

Елена МОЛОЧКО.

Зельвенский район – Слонимский район.

ЧУЛІ?

Беларускі праваабаронца стаў віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека



На 40-м сусветным кангрэсе Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека (FIDN), які праходзіць гэтымі днямі на Тайвані, адбыліся выбары кіраўніцтва аўтарытэтнай праваабарончай арганізацыі.

Прэзідэнтам на наступныя тры гады абрана адвакат з Батсваны **Эліс Магвэ**, якая да гэтага была Генеральным сакратаром FIDH.

Таксама былі абраны 15 віцэ-прэзідэнтаў па рэгіёнах. Віцэ-прэзідэнтамі па рэгіёне Еўропы і Цэнтральнай Азіі сталі **Артак Кіракасян** (Арменія), **Талекан Ісмаілава** (Кыргызстан) і **Валянцін Стэфановіч**.

Валянцін Стэфановіч лічыць, што такое рашэнне будзе спрыяць таму, каб голас праваабарончай супольнасці Беларусі мацней загучаў на міжнароднай арэне.

«Для нас, «вясноўцаў», надзвычай важна сяброўства ў FIDH, бо мы дзейнічаем разам у шмат якіх накірунках. Гэта дапамагае праводзіць міжнародную адвакацыю і дае больш магчымасцяў казаць пра сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі на міжнародным узроўні. Дарэчы, мы вельмі шчыльна супрацоўнічаем у пытанні смяротнага пакарання. Упэўнены, што досвед Федэрацыі і сяброўства ў ёй і надалей будуць дапамагаць нам прасоўваць ідэі правоў чалавека ў Беларусі».

Валянцін Стэфановіч – юрыст незарэгістраванага праваабарончага цэнтра «Вясна». Арганізацыя ўжо 15 гадоў з'яўляецца сябрам Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека. Старшыня арганізацыі **Алесь Бяляцкі** тройчы займаў пасаду віцэ-прэзідэнта па рэгіёне Еўропы і Цэнтральнай Азіі.

ЮБІЛЕЙ

Культура дапамагае ўзаемаразуменню

23 кастрычніка Польскі інстытут у Мінску распачаў святкаванне чвэрцьвекавога юбілею сваёй дзейнасці. Да гэтай даты ў сталіцу Беларусі адмыслова прывезлі копію дамовы аб Люблінскай уніі 1569 года – таго самага дакумента, з падпісання якога каронная Польшча і Вялікае Княства Літоўскае пачалі сумесную гісторыю як Рэч Паспалітая Абодвух Народаў. Зараз дакумент, спецыяльна выраблены для Нацыянальнага музея гісторыі Польшчы, могуць убачыць усе жадаючыя беларусы: ён яшчэ месяц будзе выстаўлены ў нашым Нацыянальным гістарычным музеі.

Патлумачым тым, хто не ведае: Польскі інстытут – дзяржаўная структура Польшчы, якая працуе пад эгідай польскага Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны і Міністэрства замежных спраў. Мэта існавання Польскіх інстытутаў ва ўсіх краінах – распаўсюджванне ведаў пра Польшчу і прасоўванне польскай культуры. За 25 гадоў свайго існавання Польскі інстытут у Мінску правёў шмат фестываляў класічнай і джазавай музыкі, прывозіў спектаклі і выставы твораў выяўленчага мастацтва, арганізоўваў публічныя лекцыі польскіх навукоўцаў, дапамагаў праводзіць навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя агульным старонкам гісторыі, а таксама выдаваць пераклады польскіх пісьменнікаў на беларускую мову і кнігі пра Польшчу і польскую культуру. Пры Польскім інстытуце працуе бібліятэка, арганізаваны курсы для жадаючых вывучыць польскую мову. Апошняя па часе буйная акцыя – святкаванне 200-годдзя з дня нараджэння выдатнага беларускага і польскага кампазітара Станіслава Манюшкі.

Выстава ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі – не адзінае мерапрыемства, звязанае з юбілеем Польскага інстытута. 5 лістапада ў Доме-музеі Ваньковічаў пачнецца штогадовы Месячнік польскай кнігі на Беларусі. На гэты раз – з прэзентацыі кнігі вядомай беларускай даследчыцы Людмілы Хмяльніцкай "Лёс інсургента", прысвечанай народжанаму на Віцебшчыне паўстанцу 1830–1831 гг., паэту, аўтару кнігі "Беларусь" Аляксандру Рыпінскаму. Постаць Рыпінскага сімвалічна звязвае культуры абодвух народаў, а дакументальная аповесць аб ім, над якой аўтар працавала больш за восем гадоў, стане выдатным падарункам для аматараў гістарычнай літаратуры.

У сувязі з 25-годдзем працы Польскага інстытута ў Мінску міністр культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы Пётр Глінскі ўзнагародзіў срэбраным медалём "Асоба, заслужаная перад польскай культурай" шэраг грамадзян Беларусі: былога дырэктара Брэсцкага драматычнага тэатра Аляксандра Козака, кіраўніка Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Паўла Сапоцьку, былога дырэктара Дэпартамента па ахове гістарычных помнікаў Ігара Чарняўскага, а таксама выкладчыкаў польскай мовы і нават супрацоўніка мытні.

Не сумняваемся, што культурнае супрацоўніцтва паміж беларусамі і палякамі будзе працягвацца, а ўзаемаразуменне паміж нашымі народамі – паляпшацца.

Аляксандр ФЯДУТА.

АРТ-ЖИЗНЬ

Алексиевич сыграли в Москве, в Театре Наций

На Международном фестивале современного искусства «Территория», который проходит сейчас в Москве, в Театре Наций, сыграли Алексиевич. Это сделал Государственный молодежный театр совместно с театром Meno Fortas (Литва) в спектакле «Цинк». Только что с успехом прошли два его показа.

В основе спектакля, который поставил в 2017 году выдающийся режиссер Эймунтас Някрошюс, признанный мастер поэтического театра, – две книги нобелевского лауреата по литературе Светланы Алексиевич: «Цинковые мальчики» – о выводе советских войск из Афганистана, и «Чернобыльская молитва» – о взрыве на атомной электростанции. Чудовищная катастрофа и конец изнурительной и бессмысленной войны. Эти события произошли на закате советской эпохи, в период слома и важнейших перемен.

На первый план режиссер вывел фигуру автора – писательницу, которая путешествует и собирает свидетельства очевидцев, воспоминания друзей, жен, солдат, делает путевые заметки. Так в действительности и происходило в жизни, когда Светлана Александровна собирала материал для своих книг. Вслед за Алексиевич Някрошюс обращается к прошлому, в котором осталось много темных пятен. Режиссер приглашает зрителя внимательнее вглядеться в нашу общую историю из настоящего.

«Цинк» – одна из последних работ режиссера в Литве: в 2018 году Эймунтас Някрошюс скоропостижно скончался. Мастер имел немало наград от двух государств – Литвы и России (в Москве он также много и плодотворно работал). В 1992 году Союзом театров Европы Э.Някрошюс был признан лучшим режиссером Европы.

Международный фестиваль «Территория» – крупнейшая арт-платформа в России. Более 13 лет она представляет на российской сцене самые заметные постановки театральных компаний мира, открывает новые имена и знакомит зрителей с классикой авангарда.

Виктория ДРОЗД.



Народная Воля
http://www.nv-online.info
25 КАСТРЫЧНІКА 2019 г.

ПА ВАШАЙ ПРОСЬБЕ

Нешта нічога не чую я ў апошнія месяцы пра экс-кандыдата ў прэзідэнты, вядомага пісьменніка Уладзіміра Някляева. Дзе ён, што з ім?

Аляксандр РУДНІЦКІ.

Спадар Рудніцкі! Чытайце гутарку журналіста "Народнай Волі" Алеся Сівага з Уладзімірам Някляевым, і вы атрымаеце адказы на свае пытанні.

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ: «Жонка спачатку мяне ўгаворвала, а затым наўпрост пачала выпіхваць з хаты…»

Вядомы беларускі паэт і палітык распавёў "Народнай Волі", чаму ён зараз адчувае сябе ў Швецыі неверагодна шчаслівым.

Вясной гэтага года стала вядома, што Уладзімір Някляеў атрымаў двухгадовую стыпендыю, а таксама магчымасць бясплатна пражываць у горадзе Лунд, які знаходзіцца на поўдні Швецыі. І ўжо амаль паўгода Уладзімір Пракопавіч займаецца там творчасцю…

– Шчыра кажучы, у бліжэйшы час збіраюся наведацца ў Мінск, – кажа Някляеў.

– У Лундзе вы пішаце раман пра Янку Купалу, а дакладней яго перарабляеце. Як ідзе праца?

– Праца ідзе не толькі над раманам, бо напісаў і іншыя рэчы. І хачу сказаць, што даўно трэба было з'ехаць з Беларусі, каб плённа папрацаваць.

Што датычыцца рамана, то яго можна закончыць і заўтра, але трэба яшчэ, як кажуць, шліфаваць – я змяніў канцэпцыю твора, і мне зараз самому цікавы гэты раман у новым выглядзе. Ён даў мне магчымасць выйсці на нейкія новыя тэмы. Карацей, зараз у мяне Болдзінская восень. Бог мне проста паслаў падарунак. Думаю, да Новага года закончу раман.

– Раней вы казалі, што ў Швецыі яшчэ і здароўем займаецеся…

– Мне і зараз вельмі баліць спіна. Праблемы пачаліся пасля снежня 2010 года, калі мяне збілі і кінулі ў СІЗА КДБ. Зараз практычна не магу сядзець, амаль увесь час даводзіцца знаходзіцца ці ў вертыкальным стане, ці ляжаць. Праўда, лежачы на ложку, пісаць нязручна, працую над раманам стоячы. Канторкі ў мяне няма, таму паставіў на стол крэсла, на крэсла – камп'ютар, так і друкую тэкст. Гэта вельмі складана, але тое, што



зроблена, таго вартае.

Каля двух месяцаў я практычна не адыходзіў ад стала. Пры гэтым у мяне не было ні ночы, ні дня. Я мог прачнуцца ў тры гадзіны ночы, калі прыходзіў сюжэт, і пісаць. Заснуць мог у восем раніцы, прачнуцца пад вечар. Адным словам, усё зблыталася, у мяне поўная хата персанажаў, нармальны такі дурдом. І я пачуваю сябе вельмі шчаслівым. Даўно я ў такой вар'ятні не жыў.

– Акрамя творчасці, застаецца час на нейкія іншыя мерапрыемствы?

